ВЕДАЙ НАШЫХ!

# Прафесія, якой... няма

**На міжнародным конкурсе прафесійных навыкаў, што ўпершыню праводзіўся ў кітайскім горадзе Чунцын, бронзавы медаль заваяваў Уладзіслаў Савіцкі — трэцякурснік філіяла «Маладзечанскі дзяржаўны політэхнічны каледж» УА «Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі».**

На ўдзел у конкурсе прэтэндавалі пяцёра навучэнцаў гэтай установы. Улад адзіны, хто вытрымаў працяглую і напружаную падрыхтоўку, у чым яму дапамагалі выкладчыкі спецдысцыплін Наталля Купцова, Алена Арловіч, Іна Белашчентава, Алена Дробышава, Ала Кароль, а ў якасці эксперта быў вядучы спецыяліст сталічнага ТАА «Феста» Дзмітрый Грыбаў, які вельмі цікавіцца мехатронікай. Гэта будучая прафесія і Уладзіслава Савіцкага. Як заўсёды, здольных навучэнцаў падтрымлівае кіраўніцтва каледжа. Таму ў Паднябесную хлопец адправіўся за кошт установы. Усе іншыя выдаткі па размяшчэнні, знаходжанні ў замежнай краіне і ўдзелу ў конкурсе ўзялі на сябе гаспадары.



**Адзін з момантаў конкурсу прафесійных навыкаў.**

## Адзіны беларус

У Кітаі Улад спаборнічаў у намінацыі «Акватроніка». Цікава, што такіх спецыялістаў не рыхтуюць на постсавецкай прасторы, і гэта прафесія пакуль афіцыйна не існуе, але яна наспела часам. Менавіта ў нашым політэхнічным ёсць намер у перспектыве выправіць сітуацыю.

Акватронік займаецца маніторынгам, кіраваннем і дакументаваннем розных працэсаў на збудаваннях водазабеспячэння і водаадвядзення. Як заўважыў Улад, без ведаў па хіміі, фізіцы, тэхніцы і электроніцы ў гэтай прафесіі не абысціся.

Яго супернікамі ў Кітаі былі навучэнцы з Расіі, Сербіі, Эквадора, Сірыі і найбольшая колькасць – самі гаспадары. Улад адзіны прадстаўляў нашу краіну. Увогуле, конкурс праводзіўся больш чым па сарака кампетэнцыях і быў накіраваны на прэстыж рабочых прафесій, што актуальна ў сучасным свеце.

Удзельнікі мерапрыемства спаборнічалі на працягу двух дзён.

— Гэта было вельмі цікава! У каледжы пакуль не рыхтуюць акватронікаў і няма адпаведнай вучэбнай праграмы, таму мне даводзілася самастойна «адаптаваць» назапашаны тэарэтычны багаж ведаў на практыцы, — расказвае Улад. – Так, пры дапамозе розных тэхнічных сродкаў і хімічных рэчываў мы ачышчалі ваду ад забруджванняў. А яшчэ разбіралі і збіралі гідрапомпу, з якой у жыцці ніколі не сутыкаўся.

Усе заданні былі на англійскай мове. Таму ў працэсе падрыхтоўкі Улад штудзіраваў і гэты прадмет. Наш навучэнец крыху ўступіў эквадорцу і кітайцу, якія занялі другое і першае месца



**Бронзавы прызёр міжнароднага конкурсу прафесійных навыкаў Уладзіслаў Савіцкі прыехаў вучыцца ў наш горад са Смаргоні і вельмі хоча атрымаць прафесію мехатроніка, якую лічыць цікавай і запатрабаванай на сучасным рынку працы.**

адпаведна. Калі Уладзіслаў пацікавіўся ў іншаземцаў-равеснікаў пра сістэму адукацыі ў іх краінах, то адрозненняў амаль не знайшоў. Хіба толькі яго здзівіла, што ў іх навучальнай праграме няма звычайных для нас урокаў фізкультуры: дзеці маюць магчымасць адразу скіраваць сваю ўвагу на той ці іншы від спорту і займацца ім.

## Як Улад рассмяшыў кітайцаў

Для ўдзельнікаў конкурсу падрыхтавалі цікавую і змястоўную экскурсійную праграму па горадзе Чунцын, дзе жыве больш за 30 мільёнаў чалавек. Ён уразіў сваім маштабам абсалютна кожнага.

— Незабыўныя эмоцыі засталіся ад парку памерам з беларускую сталіцу. Ён падзелены на мноства сектараў, кожны з якіх увасабляе культуру і традыцыі той ці іншай краіны. А вось цырк падобны на наш, хіба толькі звяроў не было. А яшчэ ў гэтай частцы Кітая жывуць пераважна нізкія людзі, я са сваім амаль двухметровым ростам узвышаўся над імі, нібы сцяблінка над травой. Калі выходзіў з ліфта, дык нават галавой у столь стукнуўся, чым вельмі развесяліў кітайцаў, — з усмешкай успамінае сваё падарожжа Улад.

Цяпер хлопец рыхтуецца да наступнага конкурсу ў рамках сусветнага руху «WorldSkills» — так званай алімпіяды рабочых рук. Адбудзецца ён у жніўні ў Казані.

На пытанне, у чым сакрэт яго поспеху, Уладзіслаў лаканічна адказаў:

— Трэба займацца любімай справай.

У Казані ён спадзяецца на ўдалы «матч-рэванш», бо сваім вынікам у Кітаі застаўся незадаволеным.

Акрамя вучобы, Улад знаходзіць час і на хобі, сярод якіх настольны тэніс, ігра на гітары і лацінаамерыканскія танцы. Дарэчы, на розных турнірах па танцах за восем гадоў трэніровак разам са сваёй партнёркай ён заваяваў восем медалёў.

**Ірына РАБУШКА.**
**Фота: АЎТАР, архіў Уладзіслава САВІЦКАГА.**